*А. Б. ЕЛІСЕЕЎ*
*(Мінск)*

# ЖЫЛУНОВІЧ VS КНОРЫН: ДВА ПОГЛЯДЫ НА ЎТВАРЭННЕ БССР

Зміцер Жылуновіч і Вільгельм Кнорын, верагодна, былі знаёмыя з 1918 г. Зміцер Жылуновіч павінен быў ведаць асабовы склад Аблвыкамзаха і Паўночна-Заходняга камітэта РКП(б), дзе Кнорын быў заўважнай фігурай. Кнорын, у сваю чаргу, павінен быў ведаць асабовы склад Белнацкама, а потым беларускіх секцый РКП(б): Жылуновіч быў адным з лідараў беларускіх камуністаў. Абодва былі добрымі публіцыстамі і рэдагавалі газеты: Кнорын – бальшавіцкую «Звязду», Жылуновіч – белнацкамаўскую «Дзянніцу». Калі на старонках «Дзянніцы» Жылуновіч ад самага пачатку мэтанакіравана ўздымаў і абмяркоўваў магчымасці і шляхі вырашэння беларускага нацыянальнага пытання і настойліва звяртаў увагу на неабходнасць з боку савецкай улады рабіць у гэтай справе адпаведныя захады, дык Кнорын на старонках «Звязды» ад імя Аблвыкамзаха абгрунтоўваў ідэю так званага «абласніцтва» і адмаўлення беларусам у праве на самавызначэнне. Ёсць дапушчэнне, што ў гэты час яны маглі і сустракацца. Язэп Канчар у сваіх успамінах у наступным выглядзе падае прысутных на адной нарадзе па беларускім пытанні з удзелам Леніна: «Сталін, Свярдлоў, Канчар, Кнорын, ~~Жылу~~» [1, арк. 49адв.]. Не дапісаўшы да канца, Канчар закрэсліў прозвішча Жылуновіча. У рукапісах Канчара адносна гэтай нарады далей запісана: «Ленін лічыць мэтазгодным абвясціць БССР, абавязаць П-З абкам РКП(б) і Аблвыкам Зах лічыцца з такім рашэннем», і адзначана, што на нарадзе прысутнічаў «вораг стварэння Савецкай Беларусі» [1, арк. 49адв., 50]. Не цяжка здагадацца, што ім быў Кнорын, які выступіў з прапановай адкласці прыняцце рашэння.

Пытанне аб нацыянальна-дзяржаўным вызначэнні Беларусі вырашылася на карысць беларускіх камуністаў – 1 студзеня 1919 г. Маніфестам, напісаным

Жылуновічам, была абвешчана Беларуская Савецкая Рэспубліка, а сам ён узначаліў першы савецкі беларускі ўрад. Але ўжо 7 студзеня старшыня ўрада насуперак уласнаму жаданню і дамоўленасці са Сталіным атрымаў у якасці кіраўніка спраў урада Вільгельма Кнорына. У гэты ж дзень Жылуновіч разам з іншымі беларускімі камуністамі – членамі ўрада, заявіў у ЦК РКП(б) аб немагчымасці сумеснай працы з былымі аблвыкамзахаўцамі. Апошнія трымаліся таго ж погляду адносна беларускіх камуністаў. І Усебеларускі з'езд Саветаў, які адбыўся 2–3 лютага 1919 г., не абраў Жылуновіча ў склад ЦВК Савецкай Беларусі. Кандыдатуры Жылуновіча, Язэпа Дылы і Усевалада Фальскага, як сведчыў сучаснік, былі правалены «з асаблівым скандалам, шумам і ўсеагульным хваляваннем і абурэннем» [2, с. 149]. У надрукаваным восенню 1919 г. артыкуле «Восем месяцаў Савецкай Беларусі» Кнорын не пашкадаваў фарбаў, каб падаць дзейнасць беларускіх камуністаў на чале з Жылуновічам як мага ў больш негатыўным асвятленні. Кнорын назваў Жылуновіча «белетрыстам», які «нічога не разумее ў савецкім будаўніцтве», кідаў фразы пра «авантуру Жылуновіча», пра «нікчэмнасць беларускага нацыяналізму», пра «поўную няздольнасць да кіравання краінай Жылуновіча і Ка» і інш. [3, с. 52–53]. Але ў 1927 г. для зборніка «Кастрычнік на Беларусі» да 10-годдзя рэвалюцыі Кнорын перапрацаваў гэты артыкул і выкрасліў з яго ўсе адмоўныя характарыстыкі Жылуновіча. Кнорын нават заявіў, што кандыдатуру Жылуновіча на абранне ў склад ЦВК на І Усебеларускім з'ездзе Саветаў бараніла, няхай і беспаспяхова, ЦБ КП(б)Б [4, с. 288]. На гэты час Кнорын ужо цалкам інакш глядзеў на «беларускае пытанне», з якім, па яго прызнанні, партыя спачатку «не саўладала», «не зрабіла тых вывадаў, якія яна па беларускім пытанні павінна была зрабіць» [5, с. 218–219]. «Вялікадзяржаўная тактыка кіруючай групы працаўнікоў першага беларускага савецкага ўрада адпіхнула частку беларускіх камуністаў і зрабіла перашкоду далейшаму развіццю і замацаванню звязку партыі з масамі працоўных сялян», – самакрытычна адзначаў Кнорын у 1924 г. [5, с. 219–220].

Жылуновічу, наадварот, не трэба было нічога мяняць у сваіх поглядах наконт ролі Аблвыкамзаха. Аб яго дзеячах ён у 1923 г. пісаў, што ў іх «складаўся зусім абмылковы погляд на беларускі нацыянальна-культурны рух», тады як Белнацкам і беларускія секцыі РКП(б) былі сапраўднымі абаронцамі правоў беларускіх рабочых і сялян [6, с. 72–74]. У 1923 г. такі падыход Жылуновіча не выклікаў ніякіх пярэчанняў з боку КП(б)Б. Жылуновіч неаднаразова яго паўтараў. Напрыклад, у артыкуле 1925 г. чытаем: «Прынцыпы Савецкае ўлады, Савецкае Беларусі прасякаюць добрую палову беларускіх рэвалюцыйных сіл, беларускіх рабочых і сялян і паступова гуртуюць іх перш вакол Беларускага Нацыянальнага Камісарыяту, а пасля – вакол беларускіх секцый РКП у Маскве, Пецярбурзе, Менску», і далей: «Воляю беларускіх працоўных мас у васобе канферэнцыі беларускіх камуністычных секцый РКП (25 снежня) і канферэнцыі РКП Паўночна-Заходняе вобласці (26 снежня) была абвешчана Беларуская Савецкая Рэспубліка» [7, с. 8]. Даты абедзвюх канферэнцый пададзены тут памылкова (трэба 21–23 і 30–31 снежня), але, відавочна, што сутнасць у іх чарзе.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы